круглы стол

# Змітрок Бядуля: больш блізкі і зразумелы

**Падчас круглага стала «Беларускі салавей», арганізаванага ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і прымеркаванага да 135-гадовага юбілею Змітрака Бядулі, прэзентавана грунтоўная віртуальная экспазіцыя аб жыцці і творчасці пісьменніка.**

На інфармацыйным рэсурсе бібліятэкі любы карыстальнік, не выходзячы з дома, можа знайсці падрабязныя біяграфічныя звесткі пра Змітрака Бядулю, азнаёміцца з яго кніжнай спадчынай, праглядзець галерэю фотаздымкаў з фондаў партнёраў праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця», пачытаць лісты і рукапісы літаратара, вывучыць матэрыял пра адлюстраванне яго творчасці ў розных галінах культуры.

Акцэнты ў вывучэнні творчасці Змітрака Бядулі ў сучасным сацыякультурным кантэксце Беларусі абазначыла даследчыца яго творчай спадчыны доктар філалагічных навук, прафесар Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Зоя Мельнікава.

Яфім Плаўнік, сын Змітрака Бядулі, які стаў ганаровым госцем круглага стала, падзяліўся цёплымі сямейнымі ўспамінамі. З прамовы ўсе даведаліся пра найбольш важнае: якім чалавекам быў яго бацька. Расповед пра родных пісьменніка і асяроддзе зрабіў на прысутных вялікае ўражанне: сталі больш зразумелымі некаторыя сюжэты ў творчай спадчыне пісьменніка. Дзякуючы кранальным дзіцячым успамінам Яфіма Самуілавіча асоба Змітрака Бядулі паўстала ў новых гранях.




Фота Кастуся Дробава.

*Падчас пасяджэння круглага стала.*

Працягнуў тэму сваякоў і наступнікаў Змітрака Бядулі паэт, кандыдат філалагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Віктар Жыбуль. Ён падзяліўся гісторыяй пошукаў сваякоў Змітрака Бядулі ў далёкім і блізкім замежжы.

Сярод удзельнікаў разгарнулася шырокая дыскусія аб асобе Змітрака Бядулі і яе значнасці для айчыннага літаратурнага працэсу. Як можна меркаваць з выступленняў асноўнай колькасці ўдзельнікаў, спадчына пісьменніка яшчэ не адно дзесяцігоддзе будзе асэнсоўвацца і вывучацца, гэта тая глеба, дзе заўжды будзе месца для пошукаў і адкрыццяў.

**Яна БУДОВІЧ**